Установа «Занальны дзяржаўны архіў у г.Навагрудку»

# Чамярыцкі Вячаслаў Антонавіч: даследчык беларускага слова



*Жыццё і навуковы ўклад выдатнага філолага, медыявіста і скарыназнаўцы*

Навагрудак, 2026

***Вячаслаў Антонавіч Чамярыцкі*** *нарадзіўся 22 ліпеня 1936 года ў в. Рабкі сучаснага Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1938 годзе сям'я пераехала ў Навагрудак.*

*У 1953 годзе закончыў Навагрудскую беларускую сярэднюю школу № 1.*

*З 1953 па 1958* год *вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па заканчэнні ўніверсітэта працаваў настаўнікам на Вілейшчыне, карэктарам абласной газеты ў Маладзечне, інспектарам народнай адукацыі Маладзечанскага раёна.*

*У 1965 годзе закончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, пасля чаго працаваў навуковым супрацоўнікам таго самага інстытута.*

*З 1991 года ўзначальваў аддзел гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры, пазней з'яўляўся вядучым навуковым супрацоўнікам Нацыянальнай Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусі.*

*У сферу навуковай дзейнасці В.А.Чамярыцкага ўваходзіць даследаванне гісторыі беларускага летапісання, творчасці і культурна-гістарычнай ролі беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў культуры.*








В.Чамярыцкі

## А ў т а б і я г р а ф і я

Нарадзіўся я ў вёсцы Рабкі, што на Навагрудчыне, у лета 1936-ае. Адтуль, з гэтай невялікай вёскі, што прытулілася ля бойкай дарогі Наваельня–Навагрудак, родам мая маці, бацька з сям'і навагрудскага шаўца. Хоць перад вайной бацькі пераехалі ў Навагрудак, ранняе дзяцінства маё прайшло ў асноўным у Рабках, з якімі звязаны самыя яркія мае ўспаміны. Маляўнічыя родныя краявіды, чысцюткая рэчка Ятранка, што віецца паміж пясчаных узгоркаў, сакавітая родная мова, поўныя стрыманага хараства і ўзнёсласці народныя звычаі і абрады, простыя, працавітыя і высакародныя людзі таго краю – увайшлі ў маю душу, як кажуць, з малаком маці.

Пасля – утульны старажытны Навагрудак, што экзатычна раскінуўся на высокім узгорку, з яго пакручастымі вуліцамі, з яго сівымі і суровымі, мураванымі з валуноў і цэглы вежамі замка, якія памятаюць яшчэ крыжакоў. Горад, поўны гістарычных легенд і паданняў, у якім гучным рэхам аддаюцца галасы далёкіх стагоддзяў, гераічнае мінулае нашага народа; горад, поўны ўласнага гонару і годнасці, што ён – былая сталіца княства, радзіма Адама Міцкевіча. Гэта – "мой родны кут". Найперш гэтыя мясціны Беларусі ствараюць для мяне прывабны і дарагі вобраз роднай зямлі, вобраз Бацькаўшчыны.

Школьныя гады былі вельмі цяжкімі. Ліхалецці ваеннага часу, бядота першых пасляваенных гадоў больш закранулі тыя сем'і, якія засталіся без свайго асноўнага карміцеля. Мой бацька /яго слаба помню/ не вярнуўся з вайны. Быў ён майстар на ўсе рукі, але асаблівы талент меў да сталярнай справы. Зробленыя ім рэчы яшчэ і сёння служаць людзям. Нагаравалася, намучылася маці, пакуль выгадавала, вывучыла і паставіла на ногі двух



сваіх дзяцей. Вельмі рана і мне прыйшлося браць у рукі малаток, пілу, сякеру, вілы, лапату, па-даросламу, да поту і да мазалёў натужвацца на розных работах, каб палегчыць маці здабычу куска хлеба, якога радка калі хапала.

З маленства, як толькі навучыўся чытаць, вялікім захапленнем сталі кнігі. Спачатку вельмі любіў казкі, творы пра розныя падарожжы і прыгоды, пасля паступова мяне запаланіла паэзія. З беларускіх пісьменнікаў у школьныя гады найбліжэй да сэрца былі і наймацней на мяне ўплывалі Я.Колас, М.Багдановіч і М.Танк.

Першыя спробы пяра адносяцца да пачатку 1950 года. Гэта былі вершы аб роднай прыродзе, Радзіме. Друкавацца пачаў з 1952 г. у Навагрудскай раённай газеце "Новае жыццё". Падтрымка сяброў, настаўнікаў, знаёмых акрыліла і натхніла на больш актыўную вершатворчасць, у якой практыкаваўся амаль цэлае дзесяцігоддзе. У 50-ыя гады апублікаваў у мясцовым і рэспубліканскім друку каля дваццаці вершаваных твораў. Добрым словам успамінаю з тых часоў Сцяпана Аляксандравіча, майго школьнага настаўніка, і Анатоля Клышку, майго роднага сябра, знаёмства і кантакты з якімі вельмі паспрыялі майму творчаму росту і побач з іншымі стымуламі прадвызначылі галоўны кірунак маіх будучых інтарэсаў – роднае слова, беларуская літаратура, беларусістыка.

Калі я ў 1953 г. скончыў навагрудскую СШ № 1, у мяне не было сумненняў, куды падавацца – толькі ў Мінск у БДУ на філалагічны факультэт. Вучоба ва ўніверсітэце, жыццё ў сталіцы, цэнтры беларускай культуры, не толькі ўзбагацілі мяне глыбокімі ведамі па абранай спецыяльнасці, але і садзейнічалі майму агульнаму развіццю і духоўнаму сталенню. Гэтаму спрыялі і атмасфера таго часу, напоўненага бурнымі дыскусіямі і пошукамі, актывізацыяй усяго творчага жыцця ў краіне.

Аўтабіяграфія В.А.Чамярыцкага. 1982 г. З фондаў Навагрудскага гістарычна-краязнаўчага музея

Пасля Беларускага ўніверсітэта год настаўнічаў у глухой вёсцы Слабада, што ляжыць паміж лясоў і балотаў на поўдні Нараўлянскага краю, а ў 1959 годзе пераехаў у Маладзечна, дзе яшчэ тры гады аддаў народнай асвеце: працаваў школьным інспектарам. Гэтыя гады шмат далі мне для больш сталага пазнання роднай зямлі, народнага жыцця, свайго народа і для больш глыбокага разумення яго духоўных патрэб. Тады ж канчаткова выспела ўнутранае незадавальненне дасягнутым узроўнем уласнага развіцця, адчуванне не да канца раскрытых творчых магчымасцяў і нястрымнае жаданне ісці далей, імкнуцца вышэй. Гэта падштурхоўвала паспрабаваць свае сілы ў літаратурна-крытычнай творчасці і прывяло ў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я.Купалы АН БССР. Тут я адкрыў для сябе невычэрпныя скарбы беларускай старажытнай літаратуры. Паспяхова скончыўшы аспірантуру ў канцы 1965 г. я быў прыняты на працу ў гэты ж інстытут, дзе і працую цяпер старшым навуковым супрацоўнікам. У 1967 г. абараніў дысертацыю "Беларускія летапісы як помнікі літаратуры" на атрыманне навуковай ступені кандыдата філалагічных навук.

З канца 50-х гадоў пачаў выступаць у рэспубліканскім друку з рэцэнзіямі, літаратурна-крытычнымі, публіцыстычнымі і навукова-папулярнымі артыкуламі на розныя тэмы, спачатку пераважна пра творчасць маладых беларускіх паэтаў. З таго часу апублікаваў каля паўсотні артыкулаў і рэцэнзій, а таксама змясціў у беларускіх энцыклапедыях больш шасцідзесяці артыкулаў пра найбольш значныя помнікі і жанры беларускай арыгінальнай і перакладной літаратуры XI-XVIII стст.

Самую важную задачу, сэнс сваёй літаратурна-навуковай дзейнасці бачу ў тым, каб як мага глыбей і шырэй раскрыць невядомыя багацці нашай даўняй літаратуры, якая мела з'явы ўсходнеславянскага, еўрапейскага ўзроўню і значэння, наблізіць і паставіць



на службу сучаснасці найлепшыя здабыткі культурнай спадчыны беларускага народа, уключыць іх у духоўны актыў савецкага чалавека дзеля яго маральнага ўдасканалення, творчага ўзбагачэння, гарманічнага развіцця і выхавання пачуцця патрыятызму. За два дзесяцігоддзі працы ў гэтым напрамку мне ўдалося значна пашырыць і паглыбіць ранейшыя ўяўленні пра беларускія летапісы і адвесці гэтым выдатным помнікам беларускай культуры больш пачэснае месца ў гісторыі нашай нацыянальнай літаратуры, чым яны перад тым займалі. Лёс летапіснага жанру на Беларусі я прасачыў у кнізе "Беларускія летапісы як помнікі літаратуры", першай на беларускай мове працы, спецыяльна прысвечанай гэтым творам. Падрыхтаваў таксама да друку і ўпершыню апублікаваў забытыя, але вельмі каштоўныя і цікавыя помнікі беларускай пісьменнасці XVII-XVIII стст. – Магілёўскую хроніку і гэтым самым адкрыў яе для больш шырокага ўжытку.

Другім сваім вартым увагі дасягненнем лічу ўдзел у распрацоўцы найноўшай канцэпцыі шматвяковага працэсу развіцця беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры і ўстварэнні яе першай навуковай гісторыі. Быў адным з аўтараў і рэдактараў "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры", т. I /Мн., 1968/ і "История белорусской дооктябрьской литературы" /Мн., 1977/. У апошняй, якая высока ацэнена спецыялістамі і прыхільна сустрэта шырокай грамадскасцю /у 1980 г. калектыву яе аўтараў прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР у галіне літаратуры/, майму пяру належыць амаль чвэрць кнігі: шэсць раздзелаў агульным памерам каля дзесяці друкаваных аркушаў.

Выступаю таксама і як папулярызатар пісьменнай спадчыны беларускага народа. Апрача артыкулаў і рэцэнзій у перыядычным друку, напісаў амаль сотню навукова-папулярных артыкулаў для



беларускіх энцыклапедый, шэраг раздзелаў для падручніка па беларускай літаратуры і шматтомнай "Истории всемирной литературы", якая рыхтуецца ў Маскве Інстытутам сусветнай літаратуры АН СССР. Па заказу ЮНЕСКА напісаў у сааўтарстве навукова-папулярны нарыс пра Францыска Скарыну. Кніга выдадзена двойчы /у 1979 і 1980 г./ у Парыжы па-французску і па-англійску для шырокага замежнага чытача.

Цяпер працую над кнігай "Вытокі беларускай белетрыстыкі". Хочацца абгрунтаваць на матэрыяле літаратуры старажытнага перыяду думку, што беларуская проза, якая ўпэўнена і хораша ўваходзіць сёння ў вялікі свет, не такая ўжо і маладая, як традыцыйна лічыцца, а мае вельмі глыбокія, амаль тысячагадовыя карані.

Наперадзе – новыя планы і задумы. Мару быць актыўным аўтарам "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі", прыйсці з новымі творчымі здабыткамі да вялікіх юбілеяў славянскай культуры – 800-годдзя "Слова аб палку Ігаравым" і 500-годдзя з дня нараджэння Ф.Скарыны і, наогул, больш актыўна ўдзельнічаць у літаратурным жыцці нашай рэспублікі.

30 верасня 1982 г.



Будынак Навагрудскай БСШ № 1. 1940-я гг.



Пішам сачыненне. Вучні 9-га класа Навагрудскай СШ № 1 (за першай партай В. Чамярыцкі). Чэрвень 1952 г.



Кніга пратаколаў

Навагрудскай Бел. С.Ш. №1



ОБЩАЯ ТЕТРАДЬ

1951-1952 гг.

г. Навагрудак БСШ № 1



Пратакол № 17

пасяджэння педсавета БСШ № 1 ад 18 чэрвеня

Згодна Палажэння і інструкцыі Міністэрства Асветы БССР „Аб пераводных і выпускных экзаменах у пачатковай, сямігадовай і сярэдніх школах і экзаменах на атэстат сталасці ў 1952-53 навуч. г." і згодна пастановы педагагічнага савета школы ад 25 чэрвеня 1953 г. лічыць закончыўшымі БСШ № 1 г. Навагрудка і выдаць атэстат сталасці наступным вучням 10га класа:

28. Чамярыцкаму Вячаславу.

Старшыня:

Сакратар:

Ф. 175. Воп. 1 Справа. 17. Л.29.



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ЗВЯЗДА

ОРГАН НАВАГРУДСКАГА РАЁННАГА КАМІТЭТА КП(б)Б
І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 18 (957) | НЯДЗЕЛЯ, 10 ЛЮТАГА 1952 г. | ЦАНА 15 к.

ПА-БАЯВОМУ ВЫКАНАЕМ Р...

Дружная падрыхтоўка



## НА ЛЫЖАХ

Круцяць, бурапеняць
Віхры снегавыя,
У вышыню з платамі
Гурбы намяло.

Засвісталі ветры,
Быццам-бы жывыя,
Сцежачкі—дарожкі
Снегам занясло.

А мароз, як майстра,
Ілюструе вокны,
Кветкі выраблае,
Серабром блішчыць.

Тчэ, снуе узоры—
Шоўкавы валокны,
Гаем, лесам пройдзе,
Голлем заскрыпіць.

Як люблю я раннем
Імчаць на лыжах-санках
Каля старадаўніх замкаў,
З Навагрудскіх гор.

Як мяне ты вабіш,
Беларусь-старонка,
Са сваім прыгоствам
Рэк, лясоў, азёр.

Вецер лашчыць шчокі,
Свішча каля вуха,
Снег скрыпіць марозны—
Аж займае дух.

А вакол гуляе
Бура-завіруха,
Ляцім мы з ветрам
Уперагонкі ўдвух.

Вяч. Чамярыцкі



## Люстра жыцця

Колькі раз не бяру я ў рукі «Новую зямлю», заўсёды адчуваю нейкую прагнасць і цягу да гэтага вялікага твора народнага паэта. Мне хочацца без канца працытаваць старонкі «Новай зямлі», навеяныя такой сардэчнай любоўю да роднага беларускага краю, цеплынёй і празрыстасцю беларускай прыроды, прастатой і багаццем беларускага жыцця.

Я люблю ў вольны час, узяўшы «Новую зямлю», пажыць і падыхаць з героямі паэмы Якуба Коласа, паслухаць цікавыя апавяданні дзядзькі Антося, я люблю разам з коласаўскім дзядзькам зрабіць падарожжа па Вільні.

Усёй душою і сэрцам люблю я «Новую зямлю» Я. Коласа. Разам з тым, я ўсёй душою і сэрцам спачуваю беднаму і забітаму селяніну, галоўнаму герою паэмы—Міхалу. Якое цяжкае было жыццё беларускага сялянства да рэвалюцыі пад прыгнётам розных ляснічых, паноў і кулакоў. Поўна і глыбока адлюстроўвае Я. Колас у сваім выдатным творы гэты прыгнёт беларускага сялянства. І таму, чытаючы паэму, як кантраст, я супастаўляю забітае жыццё беларускага народа да рэвалюцыі з новым шчаслівым калгасным жыццём беларускага народа, пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Вось чаму я так люблю «Новую зямлю»—вялікі дар народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

Веч. Чамярыцкі,
вуч. 10 кл. БСШ № 1.






Першыя спробы пяра.
Газета«Звязда».10.02.1952. № 18.



Выпускнік філфака БДУ. Красавік, 1958 г.



Вучоныя сектара дакастрычніцкай літаратуры Інстытута літаратуры (злева направа ў першым радзе: М. Грынчык, В. Барысенка, Ю. Пшыркоў і А. Коршунаў; у другім – В. Чамярыцкі, Л. Гусева, Р. Гульман, М. Прашковіч). 1967 г.



АКАДЕМИЯ НАУК БССР
ИНСТИТУТ ЛИТЕРАТУРЫ им. ЯНКИ КУПАЛЫ

На правах рукописи

В.А.ЧЕМЕРИЦКИЙ

БЕЛОРУССКИЕ ЛЕТОПИСИ КАК ПАМЯТНИКИ ЛИТЕРАТУРЫ
/Возникновение и литературная история первых сводов/

642 Литература народов СССР /Белорусская литература/

Автореферат
диссертации на соискание ученой степени кандидата филологических наук

МИНСК 1967



Копия Герб СССР

Министерство высшего и среднего специального образования СССР

Высшая аттестационная комиссия

ДИПЛОМ

КАНДИДАТА НАУК

№ 004003

Москва 26 апреля 1968 г.

Решением

Совета Ин-та литературы им. Я.Купалы и Ин-та языкознания им. Я.Коласа АН Бел.ССР
от 19 декабря 1967 г. /протокол № 4/

Чемерицкому Вячеславу Антоновичу
присуждена ученая степень кандидата филологических наук

М.П. Председатель Совета подпись

Ученый Секретарь Совета подпись

У 1967 годзе В.А.Чамярыцкі атрымаў навуковую ступень кандыдата філалагічных навук









УВОДЗІНЫ

Выдатнае месца сярод старажытных помнікаў пісьменнасці беларускага народа займаюць летапісы і хронікі. Багатыя сваім зместам, своеасаблівыя па форме, яны служаць для нас каштоўнай крыніцай пазнання даўняга мінулага Беларусі і Літвы — краін, якія многія стагоддзі пражылі ў цесных эканамічных, палітычных і культурных узаемаадносінах. Выкліканае да жыцця рэальнымі патрабаваннямі рэчаіснасці сярэдневяковай

...

інтэнсіўнасці і плённасці культурных узаемасувязей беларускага народа з рускім, літоўскім, украінскім і польскім народамі ў эпоху феадалізму. Усё гэта пераканаўча сведчыць аб вялікім культурна-гістарычным значэнні

5

*…Будучы помнікамі гістарыяграфіі і грамадска-палітычнай думкі свайго часу, летапісы і хронікі складаюць разам з тым цэлы этап у гісторыі беларускай старажытнай літаратуры. Лепшыя з іх – яркія ўзоры беларускай літаратурнай мовы і беларускай свецкай прозы даўняй пары.*

Дысертацыя В.А.Чамярыцкага легла ў аснову манаграфіі «Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў», выдадзенай у 1969 годзе.

Як высакакласны спецыяліст, В.А.Чамярыцкі быў запрошаны да ўдзелу ў падрыхтоўцы да выдання беларускіх тамоў акадэмічнага «Поўнага збору рускіх летапісаў».

Выдатным дасягненнем калектыву навукоўцаў, якім кіраваў Вячаслаў Антонавіч Чамярыцкі, сталі падрыхтоўка і выданне «Анталогіі даўняй беларускай літаратуры» і «Гісторыі беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў» у двух тамах. Шматгадовыя навуковыя даследаванні аўтараў і багацце выкарыстанага фактычнага маэрыялу дазволілі грунтоўна прадставіць тысячагадовую пісьмовую спадчыну беларускага народа.




В.А.Чамярыцкі з'яўляецца адным з аўтараў першых фундаментальных навуковых даследаванняў гісторыі беларускай літаратуры – «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры», якая выйшла на беларускай у 1968 г. (том 1) і рускай у 1977 г. мовах.




Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI - першая палова XVIII ст. Пад рэд. В. А. Чамярыцкага. Мінск : Беларус. навука, 2003.




Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. У 2 т.
Т.1. Даўняя літаратура XI – першая палова XVIII стагоддзя / Рэд. тома В.А. Чамярыцкі. Мінск : Беларус. навука, 2006 – 2010.
Т. 2. Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзе / Рэд. тома У.І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2007.

Адным з самых важных дасягненняў В.А.Чамярыцкага з’яўляецца ўклад у навуковае вывучэнне, рэканструкцыю і папулярызацыю спадчыны Францыска Скарыны.







Кніга «Францыск Скарына» (аўтары В.А.Чамярыцкі, Г.Я.Галенчанка, В.Ф.Шматаў) выдадзена на французскай у 1979 г. і англійскай у 1980 г. мовах



В.А.Чамярыцкі (справа) на беларуска-італьянскай навуковай канферэнцыі. Венецыя. 1992 г.



*«Набліжаючыся да Скарыны, глыбей спасцігаючы яго, мы самі ўзбагачаемся і ўзвышаемся, узвышаем беларускую культуру, наш народ. У спадчыне Скарыны – нашыя нацыянальна-духоўныя вытокі…»*

В.Чамярыцкі. Жыватворная спадчына.
Выбранае. Мінск, 2017.












Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. / Рэд. Я.Д. Ісаевіч, В.А. Чамярыцкі. Мінск : Навука і тэхніка, 1988.

За вялікі ўклад у развіццё беларускай навукі і культуры В.А.Чамярыцкі ўзнагароджаны медалем Ф.Скарыны, граматамі Прэзыдыума Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі.




У 1994 годзе Вячаславу Антонавічу Чамярыцкаму была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне навукі

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
23 снежня 1994 г. № 3469-XII/266

**Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 1994 года ў галіне навукі і тэхнікі**

Разгледзеўшы матэрыялы, прадстаўленыя Камітэтам па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:
1. Зацвердзіць рашэнне Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі і прысудзіць Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь 1994 года:

**У галіне навукі**

**Галенчаку** Георгію Якаўлевічу, кандыдату гістарычных навук, старшаму навуковаму супрацоўніку, загадчыку аддзела спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі, **Дарашкевічу** Віктару Іванавічу, кандыдату філалагічных навук, былому старшаму навуковаму супрацоўніку Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі, **Жураўскаму** Аркадзію Іосіфавічу, члену-карэспандэнту Акадэміі навук Беларусі, доктару філалагічных навук, прафесару, саветніку пры дырэкцыі таго ж інстытута, **Неміроўскаму** Яўгенію Львовічу, члену-карэспандэнту Акадэміі прыродазнаўчых навук Расійскай Федэрацыі, доктару гістарычных навук, прафесару, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, **Чамярыцкаму** Вячаславу Антонавічу, кандыдату філалагічных навук, старшаму навуковаму супрацоўніку, загадчыку аддзела гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі, **Шматаву** Віктару Фёдаравічу, доктару мастацтвазнаўства, старшаму навуковаму супрацоўніку, загадчыку аддзела старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі, – за цыкл работ «Скарына і беларуская культура».

| | |
|---|---|
| Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.Грыб | Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь М.Чыгір |

*«Радуюся і ганаруся, што слухаў выступленні Якуба Коласа і Петруся Броўкі, Максіма Танка і Васіля Быкава, Алеся Адамовіча і Ніла Гілевіча; што атрымліваў аўтографы ад Івана Мележа і Янкі Брыля, Дзмітрыя Ліхачова і Рыгора Піўтарака, Адама Мальдзіса і Генадзя Кісялёва, Радзіма Гарэцкага і Віктара Каваленкі, Міхася Мушынскага і Міхася Тычыны, іншых знакамітых пісьменнікаў і вучоных…»*

У 1984 годзе Вячаслава Антонавіча Чамярыцкага прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі



Маладыя беларускія пісьменнікі з класікамі беларускай літаратуры. У верхнім радзе ў цэнтры В.А.Чамярыцкі. Каралішчавічы.1962 г.






ПАВАЖАНЫ ТАВАРЫШ

Чамярыцкі В. А

Запрашаем Вас прыняць удзел у рабоце X з'езда пісьменнікаў БССР, які адбудзецца 25—26 красавіка 1990 года ў памяшканні Палаца культуры Белсаўпрофа (Ленінскі праспект, 25).

Пачатак у 10 гадзін.

ПРАЎЛЕННЕ
САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ
БССР



МАНДАТ

Таварыш ______

з'яўляецца дэлегатам X з'езда пісьменнікаў Беларускай ССР з правам РАШАЮЧАГА голасу.

Красавік 1990

*«… Заўсёды цягне мяне на маляўнічую, шчымліва родную Навагрудчыну, дзе спяць вечным сном мае продкі, сваякі, мая матуля, дзе кожная мясціна – невычэрпная скарбніца нашай незвычайна багатай культурна-гістарычнай спадчыны, шматвяковай беларускай мінуўшчыны…»*



З НАГОДЫ

# Захавальнік слова, творца думкі

**У апошнюю нядзелю студзеня ў Беларусі традыцыйна адзначаецца Дзень беларускай навукі – свята тых, хто прысвяціў сябе пошуку ісціны, захаванню і прымнажэнню ведаў. У гэты дзень мы з асаблівым гонарам гаворым пра навукоўцаў, чый уклад у развіццё краіны неацэнны. Сярод такіх знакамітых асоб – Вячаслаў Антонавіч Чамярыцкі.**

Вячаслаў Антонавіч нарадзіўся 22 ліпеня 1936 г. у вёсцы Рабкі Дзятлаўскага раёна. У 1937 г. сям'я пераехала ў Навагрудак. Ваеннае ліхалецце маці і двое дзяцей перажылі ў сваякоў у вёсцы. Бацька пайшоў на фронт і прапаў без вестак.

Пасля заканчэння школы ў Навагрудку Вячаслаў Чамярыцкі паступіў у БДУ на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта. У 1965 г. закончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, пасля чаго працаваў навуковым супрацоўнікам таго ж інстытута. З 1991 г. узначальваў аддзел гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры, пазней – галоўны навуковы супрацоўнік НАН Рэспублікі Беларусь.

Цікава, што выступаць у друку В.А. Чамярыцкі пачаў з вершамі (з 1952 г. у нашай газеце «Новае жыццё»), а з 1959 г. – з рэцэнзіямі і артыкуламі пра творчасць маладых паэтаў. Але потым захапіўся старажытнай беларускай літаратурай і гісторыяй і ўнёс вялікі ўклад у вывучэнне беларускага летапісання.

Яго імя непарыўна звязана з Інстытутам мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе ён, будучы кандыдатам філалагічных навук, кіраваў адным з ключавых аддзелаў. Вячаслаў Антонавіч – прызнаны эксперт у галіне вывучэння беларускай літаратуры, чые працы складаюць залаты фонд айчыннай гуманітарнай думкі.

Заслугі Вячаслава Антонавіча былі высока ацэнены дзяржавай – ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, што з'яўляецца сведчаннем выключнай значнасці яго працы для краіны.

Дзейнасць Вячаслава Антонавіча Чамярыцкага выходзіць за рамкі вузкіх навуковых дысцыплін. Яго працы – гэта ўклад у захаванне і развіццё беларускай мовы, літаратуры і культуры ў цэлым. Яны дазваляюць нам не толькі лепш разумець класікаў, але і адчуваць сувязь часоў, фарміраваць нацыянальную ідэнтычнасць і перадаваць неацэнную спадчыну наступным пакаленням.

У Дзень беларускай навукі мы выказваем глыбокую ўдзячнасць Вячаславу Антонавічу Чамярыцкаму за яго шматгадовую плённую працу, за адданасць справе і неацэнны ўклад у развіццё беларускай філалогіі. Яго дзейнасць – гэта яркі прыклад служэння навуцы і Айчыне.

Падрыхтавала
В. ПІСАР, «НЖ».

Газета «Новае жыццё». 24.01.2026. № 6.




Дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі І.М.Царук віншуе В.А.Чамярыцкага з юбілеем. 2016 г.



Ля помніка А.Міцкевічу ў г. Навагрудку



В.А.Чамярыцкі ў чытальнай зале Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Навагрудку з А.С.Забелінскай, дырэктарам архіва. 2025 г.

В.А.Чамярыцкі з’яўляўся адным з аўтараў і навуковых рэдактараў кнігі «Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Навагрудскі раён»








В.А.Чамярыцкі дапамагаў у стварэнні і адкрыцці Навагрудскага гістарычна-краязнаўчага музея, браў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні навукова-краязнаўчых канферэнцый «Наваградскія чытанні»








В. А. ЧАМЯРЫЦКІ (г. Мінск)

Ранняя гісторыя горада ў першай манаграфіі пра Наваградак




В. ЧАМЯРЫЦКІ (Мінск)

Гісторыя назвы горада:
Новы гарадок—Наваградак—Навагрудак

—15—






Навагрудскі гістарычна-краязнаўчы музей



*«...Асаблівую ўзрушанасць адчуваю, калі наведваю родную школу, адкуль я вылецеў у вялікі свет, калі ўзнімаюся на Наваградскі замак, дакранаюся да яго старадаўніх муроў і з вышыні птушынага палёту ўглядаюся ў адвечныя краявіды Бацькаўшчыны».*









У роднай школе. Сустрэча В.А.Чамярыцкага з вучнямі СШ № 1 г. Навагрудка. 10.11.2022.

Новогрудский районный исполнительный комитет
Президиум Новогрудского районного Совета депутатов

## РЕШЕНИЕ

22 июня 2009 г. № 82/459

г. Новогрудок

О занесении сведений в Книгу Славы Новогрудского района

В соответствии с Положением о Книге Славы Новогрудского района и с целью формирования общественного признания и сохранения памяти о людях, своим трудом и активной общественной деятельностью внесших значительный вклад в производственно-экономическое и социально-культурное развитие района, прославивших Новогрудчину высокими достижениями, совершивших подвиг или героический поступок при защите Отечества, Новогрудский районный исполнительный комитет и президиум Новогрудского районного Совета депутатов РЕШИЛИ:

1. Занести в Книгу Славы Новогрудского района сведения о гражданах согласно приложению.

2. Контроль за выполнением настоящего решения возложить на заместителя председателя Новогрудского районного исполнительного комитета Груцу В.Л.

Председатель Новогрудского районного исполнительного комитета А.К.Кулак

Председатель Новогрудского районного Совета депутатов С.В.Чубрик

---

Приложение
к решению Новогрудского
районного исполнительного
комитета и президиума
Новогрудского районного
Совета депутатов
22.06.2009 № 82/459

СПИСОК
граждан, сведения о которых занесены в Книгу Славы Новогрудского района

Божко Никандр Иван
производственным участком
«Принеманский» Новогрудс
орденом Трудового Красного
Каган Джек (Идель) -
гетто в годы Великой Оте
движения в Беларуси. Орг
увековечению памяти жертв
Новогрудке. Гражданин Вели
Касабуцкий Адам Ан
Новогрудского торгово-экон
Отечественной, Второй миро
Костюк Михаил Пав
Национальной Академии Н
профессор. Действительный
и искусств. Бывший директор
заведующий отделом инстит
Беларуси.
Кунашко Василий Сер
колхоза имени Ленина Н
Октябрьской революции, дв
Участник Великой Отечестве
Николаев Николай Викт
книговед. Доктор филологиче
Российской Национальной би
Олешкевич Федор
нейрохирург. Академик Наци
медицинских наук, профессо
медицинского института, и

---

2

исследовательского института неврологии, нейрохирургии и физиотерапии, главный нейрохирург Министерства здравоохранения Республики Беларусь.

Писарук Николай Константинович (посмертно) - бывший бригадир полеводческой бригады, заведующий производственным участком колхоза имени Кутузова Новогрудского района. Награжден орденом Ленина, орденом Октябрьской революции.

Розум Василий Семенович (посмертно) - бывший первый секретарь Новогрудского райкома Коммунистической партии Белоруссии, председатель исполнительного комитета Новогрудского районного Совета депутатов. Награжден двумя орденами Трудового Красного Знамени, орденом «Знак Почета».

Романович Таисия Степановна - пенсионерка, бывшая звеньевая по выращиванию льна колхоза «Звезда» Новогрудского района. Награждена орденом Ленина, орденом Октябрьской революции, орденом Трудового Красного Знамени.

Светочева Елизавета Андреевна (посмертно) - бывший хирург. Участница Великой Отечественной войны. Хирург Западного и 3 Белорусского фронтов. В послевоенное время - хирург, заведующая хирургическим отделением Новогрудской районной больницы, главный врач Новогрудского туберкулезного диспансера. Заслуженный врач БССР. Награждена орденом Ленина, двумя орденами Красной Звезды, орденом Отечественной войны 1 степени.

Сураго Николай Иванович (посмертно) - бывший председатель колхоза «Свитязь» Новогрудского района. Участник Великой Отечественной войны. Награжден орденом Октябрьской революции, двумя орденами Трудового Красного знамени, орденом Отечественной войны.

Чемерицкий Вячеслав Антонович - белорусский литературовед, критик, текстолог, переводчик. Кандидат филологических наук. Заведующий отделом института языка и литературы Национальной Академии Наук Беларуси. Лауреат Государственной премии Беларуси.

Шишея Николай Семёнович - пенсионер. Участник Великой Отечественной войны. Минометчик. В послевоенное время - бухгалтер колхоза имени Щорса Новогрудского района. Награжден орденом Красной Звезды, четырьмя медалями «За отвагу».

Яцукевич Иван Федорович (посмертно) - бывший начальник управления сельского хозяйства Новогрудского райисполкома, председатель колхозов «Новый путь», «Коммунар» Новогрудского района, директор льносемстанции. Награжден тремя орденами Трудового Красного Знамени.

---

Рашэнне Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Навагрудскага раённага Савета дэпутатаў ад 22.06.2009 № 82/459 «Аб занясенні звестак у Кнігу Славы Навагрудскага раёна. Ф. 33. Воп.4 С. 127. Лл.3-5.





З далёкага 16 ст. даносіцца да нас магутны голас Францішка Скарыны, як запавет гучаць яго мудрыя і пранікнёныя словы: любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, „лекі для душы"; шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас „ласкавы Бог на свет пусціў"; любіце бацькоўскую зямлю, „дзе вы нарадзіліся і былі ўзгадаваныя"; і не шкадуйце сіл, каб дзейна паслужыць свайму народу, бо „вера без спраў мёртвая".

Будзем жа годныя запавету вялікага беларускага Асветніка!